УДК 93/94“1939/1945”

# ЗНАЧЭННЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ І ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ ДЛЯ ІНДЗЕЯНІСТАЎ (ПРАЗ ПРЫЗМУ ПЕРАПІСКІ)

**Сімакоў Аляксандр Васільевіч,**
*краязнаўца,*
**г. Гомель, Рэспубліка Беларусь**

*Ключавыя словы: сусветныя войны, Беларусь, індзейцы, кампаратывістыка, кантакты, карэспандэнцыя.*

*Рэферат. У паведамленні падсумоўваецца вопыт пошуку і апрацоўкі інфармацыі па каналах звычайнай і электроннай перапіскі ў перыяд з 1985 па 2017 г., які скончыўся напісаннем вялікага артыкула па беларуска-індзейскіх сувязях у час Другой сусветнай вайны. Пералічваюцца рэспандэнты і закранутыя ў лістах пытанні, цытуюцца анкета да 40-годдзя Перамогі і ліст ветэрана.*

Для скарочанага абазначэння Вялікай Айчыннай вайны і Другой сусветнай вайны, узятых разам, у гэтым паведамленні ўжываецца апошні элемент у адзіночным ліку – вайна.

Месца і значэнне ўніверсальнай і спецыфічнай праблематыкі, звязанай з перыядам 1939–1945 гг., абумоўленыя асаблівым драматызмам падзей, якія прывялі да страт жыццяў і матэрыяльных каштоўнасцей, масавых і цяжкіх псіхалагічных, маральных траўм. Пры вывучэнні беларуска-індзейскіх сувязей (БІС) мы рана вылучылі гэты перыяд як адзін з найбольш цэльных і самых забяспечаных інфармацыяй.

Спецыфічны, вузкаспецыялізаваны агляд вайны – не іранічны, нягледзячы на вялікую колькасць параўнанняў сатырычнага і павярхоўна-гумарыстычнага характару, а таксама нядобрасумленныя і празмерна ангажаваныя, тэндэнцыйныя трактоўкі, якія часта з'яўляюцца ў публіцыстыцы і творах мастацтва ідэалагічных працаўнікаў і ўтвараюць вялікую групу дадзеных для аналізу.

Акрамя кампаратывістычнага даследавання, заснаванага галоўным чынам на друкаваных крыніцах [7] (рэдка – свае ўласныя паралелі [1]), унікальнага толькі кампаноўкай матэрыялу, карысць гістарычнай навуцы і грамадскім інтарэсам могуць прынесці факты, якія знаходзяцца ў нашых перапісках і дзённіках – вынік індзеяніcцкай дзейнасці. Глыбокае вывучэнне біяграфій беларуска-амерыканскіх дзеячаў, у асноўным з неіндзеяніcцкім матэрыялам, такіх як доктар Русель (Судзілоўскі) і святар Мікалай Грынкевіч, матывавалася зыходнымі фактамі, звязанымі з індзейцамі, – нашчадкі або блізкія сваякі нашых асноўных герояў таксама ўпісаліся ў хронікі вайны.

Сан-Францыска, Радам, Гомель – прыклады многіх тэматычных перакрыжаванняў, напрыклад, эксклюзіўныя матэрыялы (дакументы пра ўдзел у вайне) атрыманы (у дужках – каго тычыцца) ад наступных карэспандэнтаў: Г. Судзілоўскі (даведка пра знаходжанне і смерць у Куйбышаўскім ваенным шпіталі 21.12.1941 г. Георгія Аляксандравіча Судзілоўскага – біяграфічна звязаны з Сянно), індзеяніст А. Снітко (дакументы, якія пацвярджаюць удзел яго бацькі ў вызваленні гарадоў Усходняй Еўропы, у прыватнасці Радама), К. Мазурэк (Мартышы; з параўнальна блізкіх да Радама, дзе аўтар кнігі пра самага славутага з іх – св. Васіля [6] – працуе бібліятэкарам, Кельцаў, вызваленых Чырвонай Арміяй, звязаныя яго брат Мікалай і іншыя сваякі).

Змястоўныя лісты з эксклюзіўнай інфармацыяй атрыманы ад індзеяніста Дж. Саўкова (лёс яго сям'і, якая ў сувязі з вайной трапіла ў Аўстралію), дачкі Л. Выгоцкага Г. Выгодскай (пра франтавіка І. Выгодскага, сына літаратара Д. Выгодскага). З польскім пісьменнікам А. Амільяновічам абмяркоўваліся першыя гады акупацыі Польшчы. Перакладчык і ветэран вайны А. Дзевель паведаміў дэталі пра яго блізкага калегу і таксама ветэрана А. Ломана, немца ў падпольнай рабоце. Н. Аўсяевіч (Віцебск, дзе перад вайной перайшла на другі курс медінстытута), сувязь якой з ваеннай тэмай – не толькі праз літаратуру (Сат-Ок), індзеяніста А. Ясяненку і пісьменніка, перакладчыка Сат-Ока Ю. Стаднічэнку, але і непасрэдна – апісаныя ёй у перапісцы з намі выпрабаванні яе і яе сям'і, уключаючы яе знаходжанне ў рабочым лагеры ў Крейцнаху (Бад-Кройнцах). Класік савецкай геаграфіі А. Ісачанка паведаміў факты пра лёс яго сям'і, дома і асабістай бібліятэкі ў Гомелі ў час вайны [3; 4; 5].

Ранняй і найбольш рамантычнай ініцыятывай была наша анкета пра ўдзел індзейцаў у вайне, прысвечаная 80-годдзю Перамогі (1985).

Беларуска-індзейскае таварыства пачалі ствараць два гомельскія індзеяністы, якія пазнаёміліся толькі ў 1986 г. (лістапад; ужо ў снежні сфармулявалі ідэю стварэння БІТ), таму было адзначана, што анкета падрыхтаваная гомельскім філіялам маскоўскай індзеяніСцкай арганізацыі (якая таксама не існавала як юрыдычная прызнаная або нефармальная структура). У чарнавіку ж была зроблена і спроба прыпісаць ініцыятыву анкеты іншай неіснуючай арганізацыі (існавала толькі ідэя яе) – «аддзяленню індзеяністыкі Беларускага таварыства амерыканістыкі» (Гомельскі філіял) («отделение индеанистики Белорусского общества американистики (Гомельский филиал))».

У анкеце было 11 пытанняў:

1. Што Вы ведаеце аб удзеле індзейцаў ЗША і іншых краін у Другой сусветнай вайне?

2. Найважнейшы ўклад індзейцаў у перамогу саюзнікаў над гітлераўскай Германіяй і мілітарысцкай Японіяй.

3. Назавіце імёны ўсіх вядомых вам індзейцаў, якія праявілі гераічнасць

падчас ваенных дзеянняў.

4. Ці ведаеце Вы аб удзеле індзейцаў у вайне на ўсходнім фронце?

5. Ці адзначаны прамыя кантакты паміж індзейцамі і савецкімі воінамі пры ўзаемадзеянні савецкіх і англа-амерыканскіх войскаў?

6. Індзейцы ў ліку іншых ваеннапалонных на тэрыторыі, акупаванай Германіяй.

7. Індзейцы на Ціхаакіянскім тэатры ваенных дзеянняў.

8. Плямёны, якія ўнеслі найбольш значны ўклад у ваенныя намаганні краін Амерыкі.

9. Колькасць індзейцаў, якія ўдзельнічалі ў вайне: часці і падраздзяленні, роды войскаў.

10. Працоўны ўклад індзейцаў.

11. Што вы ведаеце аб трагічным лёсе індзейцаў – герояў Другой сусветнай вайны пасля яе заканчэння?

Пад саюзнікамі мелася на ўвазе ўся антыгітлераўская кааліцыя. На аркушы чарнавіка анкеты намі быў складзены невялікі бібліяграфічны дадатак па пытанні – публікацыі, якія маглі быць крыніцай і для нашых калег-аднагодкаў.

Адказы прыйшлі ад індзеяністаў з Украіны і Расіі (адзін у той момант праходзіў тэрміновую ваенную службу) А. Ясяненкі, І. Гурава, С. Нямкова, К. Пятровай. Адказы дадзеныя ў перыяд з 20 па 31 мая.

Наступныя 40 гадоў прынеслі плён у зборы інфармацыі і па вышэйпрацытаваных пытаннях.

З'явіліся цэлыя кнігі з рэзкай пастаноўкай пытання пра падабенства нямецкай узброенай экспансіі на ўсход і каланізацыі Амерыкі.

У значнай колькасці лістоў індзейскім і неіндзейскім адрасатам мы згадвалі прозвішчы беларускіх калабарацыяністаў, якія перабраліся за акіян і падазраваліся ў ваенных злачынствах, або іх калектыўны вобраз – на нашу думку, падобнае пагражала добрай рэпутацыі беларусаў у ходзе збліжэння з індзейцамі. З індзеянісцкіх пазіцый абмяркоўваліся (у т. л. з парламентарыямі з ліку ветэранаў вайны) перспектывы сімволікі, вакол якой вяліся спрэчкі.

2006 г. адзначаны заканчэннем і змяшчэннем у нашым унутраным бюлетэні артыкула «Індзейцы і беларусы ў час другой сусветнай вайны». У канцы 2017 г. на яго аснове быў падрыхтаваны і выйшаў у вядомым часопісе артыкул памеру, пераходнага ад брашуры да кнігі [2]. У час працы над пашыранай версіяй артыкула ў Беларуска-індзейскай бібліяграфіі (БІБ) утварылася службовая абрэвіятура (код) для збору літаратуры па пытанні – «вй» (з дапамогай яго можна шукаць матэрыял у нашых файлах).

У версіі артыкула 2006 г. упершыню згаданы факт з ліста сусветна вядомага ветэрана А. Сільвашкі – дырэктара школы ў Клецкім раёне (адзін з двух найбольш вядомых персанальных сімвалаў сустрэчы на Эльбе, украінец, які, аднак, пасля

вайны пасяліўся ў Беларусі). Наша пытанне тычылася яго магчымых сустрэч з ветэранамі вайны – індзейцамі.

«12 сакавіка 1988 года

Дарагія сябры!

Прашу прабачэння за затрымку адказу. Знаходзіўся ў санаторыі. Са зместу ліста стала ясна, што справа, за якую вы ўзяліся, патрабуе вялікай працы, але гэтага палохацца не варта. Я падтрымліваю і буду аказваць пасільную дапамогу. У перспектыве я буду яшчэ ў ЗША і глыбока займуся гэтым пытаннем. Зараз толькі паведамлю, што ў Нью-Ёрку я бачыў у аэрапорце такога чалавека, якога самі амерыканцы акружылі і вялі з ім нейкую размову, а затым фатаграфав[алiся] і фатагр[афавацца] падыходзіла вельмі шмат людзей. Адным словам, я жадаю поспеху і прашу напісаць канкрэтна пытанні. Я пастараюся адказаць. Рыхтуюся да паездкі ў ЗША 24 крас. 1988.

Са шчыр[ай] павагай

(роспіс)» (пер. з рус.).

Наша карэспандэнцыя (тэкставыя паведамленні, улажэнні), тэхнічныя дзённікі (якія таксама набіраюцца, алічбоўваюцца, расшыфроўваюцца ў адпаведнасці са спісам прыярытэтных тэм, у якім сярод высокіх прыярытэтаў – вайна) з'яўляецца крыніцай нашых ведаў пра вайну і праз удакладненне ўдзелу ў вайне нашых карэспандэнтаў (у спісе іх – сотні непасрэдных і ўскосных удзельнікаў вайны, сярод іх – Герой Савецкага Саюза лацінаамерыканіст В. Вольскі, партызан Л. Пілатовіч з Пухавічаў). Вывучэнне тэкстаў, уключаючы эпісталярны матэрыял, удзельнікаў вайны з элементамі калабарацыянізму, такіх як І. Андрушкевіч (Аргенціна; яго рэпутацыя не аспрэчвалася ў сучаснай Расіі) і шэраг беларусаў у ЗША і Канадзе (у т. л. тыя, каго мы сустракалі ў Беларусі) – неабходны элемент у нашай працы.

З 18.09.1917 г., калі адбылося пераключэнне на задачу дапрацоўкі і расшырэння артыкула пра вайну 2006 г., і да канца лістапада, а ў снежні ў меншым аб'ёме адбываліся абмены з больш чым паўсотняй асоб з шырокай геаграфіяй пражывання і вялікай разнастайнасцю пытанняў, у якіх яны былі кампетэнтнымі: Л. Александровіч-Пэндзіх, І. Андрушкевіч, Н. Анофранка, А. Безкаравайны, С. Бурмістр, І. Варывончык, А. Вудэн, Р. Гелатлі, К. Герлах, Л. Глагоўская, Ю. Глушакоў, А. Говар, П. Горал, Ю. Грыбоўскі, М Гыек, А. Дзярновіч, А. Ермакоў, С. Ёрш, В. Жыбуль, А. Зюлкоўская-Боэм, Я. Іванюк, Э. Іофе, І. Касцян, М. Кліменка, Г. Красільшчык, Г. Лабадзенка, А. Ластоўскі, М. Лукша, Л. Люкс, А. Марозава, Т. Масціцкі, В. Махнач, С. Мінскевіч, Я. Мурашка, А. Мядзведзеў, А. Новікаў, Р. Палчанінаў, А. Пяршай, В. Раманаў, В. Раўчанка, В. Рубінчык, П. А. Рудлінг, Л. Рэйн, Д. Серабракоў, С. Сілава, У. Станкевіч, А. Умланд, Э. Уэстэрман, Дж. Фадэн, Л. Хайлеман, Я. Харкевіч, С. Шабельцаў, З. Юркевіч (спіс не вычарпальны і не ўключае адрасатаў, уключаных у спісы на рассылкі – у ім, у

прыватнасці, былі В. Кіпель, Я. Запруднік, І. Куніцкі). Найбольш электронных паведамленняў у перыяд падрыхтоўкі артыкула ўключае перапіска з рэдактарам Г. Сагановічам, які зрабіў рэпліку наконт памеру, а адначасова агульную ацэнку вартасцей артыкула «Дашліфоўвай, сам вырашай, што пакідаць. Потым можаш зрабіць кніжачку на падставе сабранага, але часопісны артыкул – гэта артыкул» (электроннае паведамленне ад 3.11.2017).

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Симаков, А. Память о Вундед-Ни (Исторические параллели : Вундед-Ни – Хатынь) / А. Симаков // Ленинец (газета Минского высшего военно-политического общевойскового училища). – 1991. – 17 янв. – 4 с.
2. Сімакоў, А. Беларусы і індзейцы : Другая сусветная вайна / А. Сімакоў // Беларускі гістарычны агляд. – 2017. – Т. 24. – Сш. 1–2 (снеж.). – С. 89–130.
3. Сімакоў, А. З гісторыі пра вядомага географа / А. Сімакоў // Голас Радзімы. – 2022. – 29 крас. – 6 с.
4. Сімакоў, А. У імкненні да ведаў пра Зямлю : як стаў географам дзякуючы адной кнізе гамяльчанін Анатоль Ісачанка / А. Сімакоў // Краязнаўчая газета. – 2022. – № 1 (студз.). – 6 с.
5. Сімакоў, А. У пагоні за ведамі : як стаў географам, дзякуючы адной кнізе, гамяльчанін Анатоль Ісачанка / А. Сімакоў // Наша слова. – 2021. – 2 снеж. – 4 с.
6. Mazurek, K. Życie i działalność księdza Bazylego Martysza : droga do świętości / K. Mazurek. – Warszawa : Dom Wydawniczy Elipsa, 2018. – 181 s.
7. Rudling, P. A. The Khatyn massacre in Belorussia : a historical controversy revisited / P. A. Rudling // Holocaust and Genocide Studies. – 2012. – № 1. – P. 29–58.

УДК 93/94“1939”(476)

## ПОХОД КРАСНОЙ АРМИИ 1939 Г. В ЗАПАДНУЮ БЕЛАРУСЬ В ОТРАЖЕНИИ СОВЕТСКОЙ ПРОПАГАНДЫ

**Субботин Александр Александрович,**
*кандидат исторических наук, доцент,*
*заведующий кафедрой социально-гуманитарных дисциплин,*
**Витебский государственный технологический университет,**
**г. Витебск, Республика Беларусь**

*Ключевые слова: Западная Беларусь, пропаганда, Красная Армия, Польша, Вторая мировая война, СССР, БССР.*